# ПРАЗ ДЫЯЛОГ МОЎ – ДА ДУШЫ, ДА СЭРЦА

***У Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый зладзіў традыцыйную акцыю па напісанні дыктоўкі. У анлайн-рэжыме ў мерапрыемстве прынялі ўдзел студэнты і выкладчыкі Стаўрапольскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута і Варонежскага дзяржаўнага ўніверсітэта.***

«Сёлета ў якасці тэксту дыктоўкі мы ўзялі ўрывак з паэтычнага звароту Марка Шагала «Да майго горада», які быў апублікаваны ў 1944 годзе, – расказаў дэкан факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый Сяргей Нікалаенка, доктар педагагічных навук, прафесар. – Пішуць яго на беларускай мове не толькі нашы хлопцы і дзяўчаты, але і студэнты з расійскіх устаноў вышэйшай адукацыі – нашых партнёраў. Акрамя дыктоўкі мы прапануем ім перакласці ўвесь паэтычны зварот сусветна вядомага мастака на беларускую мову. Такім чынам і адбудзецца сапраўдны дыялог моў і культур».

На пачатку мерапрыемства кіраўнікі ўніверсітэтаў-партнёраў павіншавалі Машэраўцаў з 30-годдзем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і 1050-годдзем з дня заснавання Віцебска, адзначыўшы, што ў нашых дзяржаў – агульная гісторыя, што мы разам імкнемся да захавання гістарычнай памяці і верым у аднолькавыя ідэалы.

Тэкст дыктоўкі прачытаў дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі Віталь Падстаўленка.



**Фота Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**